В.А.Чарняк

## ПРА НОВЫ АСПЕКТ ХАРАВОГА ВЫХАВАННЯ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ МУЗЫКІ

Музычнае мастацтва Беларусі - важнае звяно духоўнай культуры грамадства, гэтай складанай і шматсастаўнай з'явы, якую характарызуюць самасвядомасць народа, яго адукацыя, высокі прафесіяналізм спецыялістаў розных галін ведаў.

У цэнтры нашай увагі - музычнае мастацтва, а дакладней, харавая пеўчая культура, якая ахоплівае найбольш шырокія слаі насельніцтва. Справа ў тым, што харавая пеўчая культура знаходзіцца ў перыядзе росквіту, аднак рэпертуар выканаўчых калектываў пакуль што зарыентаваны на творчасць сучасных кампазітараў і не так даўно асобныя харавыя калектывы звярнуліся да духоўнай музыкі - неад'емнай часткі харавых спеваў мінулых стагоддзяў. У сувязі з гэтым неабходна ўвесці вывучэнне харавой культуры мінулых стагоддзяў і шырэй - старадаўняй духоўнай і сучаснай музыкі, а пачынаць такую справу трэба са школы.

Пашырэнне пеўчага рэпертуару ў агульнаадукацыйных школах звязана з увядзеннем старабеларускіх песнаспеваў, кантаў, гімнаў гуманістычнага зместу на свецкую тэматыку (калі ў школах вывучаецца Закон Божы, то і на рэлігійную тэматыку). Адсюль вынікае неабходнасць:

а) вывучэння спецыфікі старабеларускай пеўчай культуры ў кантэксце сацыяльных і гістарычных праблем;

б) даследавання пытанняў гісторыі развіцця беларускай музыкі і культуры, а таксама жанраў і стыляў беларускага музычнага мастацтва ХУП-ХІХ стагоддзяў;

в) вывучэння творчасці беларускіх кампазітараў дасавецкага і савецкага перыядаў - аўтараў харавых твораў духоўнага зместу;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

г) выкананне напісаных імі харавых твораў.

Пашырэнне пеўчага рэпертуару за кошт яго ўзбагачэння духоўнай музыкай звязана з распрацоўкай наступных аспектаў:

І. Вывучэнне харавой пеўчай культуры на прыкладзе творчасці кампазітараў дасавецкага і савецкага перыядаў - аўтараў духоўнай музыкі.

2. Засваенне манеры спеваў культавай і старажытнай музыкі: знаменных распеваў, спецыфічных ладоў, якія патрабуюць правільнага інтанавання павялічаных інтэрвалаў, роўнага, працяглага дыхання, асобага спосабу гуказдабывання, звязанага са схільнасцю да псальмадавання і рэчытацыі, ды інш.

3. Папярэдняе праслухоўванне, аналіз гэтай музыкі і падрабязнае тлумачэнне настаўніка адносна яе выканання.

Спяванне духоўнай музыкі павінна быць глыбока асэнсаванае, г.зн. школьнікі павінны ведаць жанры (кант, гімн, псальмодый і г.д.), дзе і калі пэўны твор спяваецца, што азначае яго змест, у сувязі з чым ён выконваецца. Такім чынам, вучням належыць ведаць гісторыю не толькі жанру, але і напісання дадзенага твора. Акрамя таго, пры граматным выкананні прадугледжваецца таксама разуменне формы музычнага твора, што можа патлумачыць школьнікам толькі настаўнік музыкі (зразумела, ён павінен свабодна валодаць усімі гэтымі ведамі).

Пры такім падыходзе дапускаецца ўвядзенне ў рэпертуар музыкі твораў сучасных беларускіх кампазітараў: М.Туранкова, М.Равенскага, А.Мдзівані, Л.Шлег, А.Бандарэнкі.

Накіраванасцю азначанай работы маецца на мэце садзейнічаць развіццю нацыянальнай самасвядомасці дзяцей з самага ранняга ўзросту, выхоўваць у іх пачуццё нацыянальнай годнасці, развіваць інтэлектуальны кругагляд, усведамленне дзяцей аб місіі беларускай нацыі ў станаўленні славянскага свету.

На першы погляд, пашырэнне песеннага рэпертуару, які дамінуе ў школах за кошт увядзення новага, - пытанне нескладанае, але гэта не зусім так. Толькі песенным рэпертуарам не вырашыць тых гуманістычных задач, што ставіць настаўнік перад вучнямі.

Мы не выключаем песеннага рэпертуару цалкам, але не лічым яго дамінуючым, таму што выкананне савецкіх масавых песень не дазваляе асэнсаваць харавую музыку ў кантэксце сусветнай культуры, а тым больш духоўнай культуры грамадства. Тут маюцца на ўвазе масавыя песні, якія здольны выклікаць толькі пэўныя, нават спе-

цыфічныя эмоцыі: пачуццё радасці, адчуванне шчаслівага дзяцінства і г.д. На савецкай масавай песні выхоўваць пачуццё нацыянальнай самасвядомасці вельмі цяжка.

З другога боку, цяжкасць заключаецца яшчэ і ў тым, што дадзены рэпертуар (духоўная музыка) дагэтуль не атрымаў шырокага распаўсюджання. Педагогі і студэнты, будучыя настаўнікі музыкі, пакуль недастаткова валодаюць дадзеным пытаннем.

Каб змяніць такое становішча, неабходна: увесці ў курс харазнаўства цыкл лекцый па гісторыі старадаўняй духоўнай і сучаснай харавой пеўчай культуры Беларусі, методыку выканання духоўных харавых твораў, уключыўшы яе ў праграму курса практычнага харавога дырыжыравання (выканання) старадаўняй духоўнай і сучаснай беларускай музыкі.

Крыніцы ёсць, вядуцца актыўныя распрацоўкі ў гэтым кірунку ў Акадэміі музыкі, Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Дадзеная тэарэтычная праблема і практычнае яе вырашэнне надзвычай актуальныя. Вынікам гэтай дзейнасці будзе кваліфікаваная падрыхтоўка настаўніка музыкі з выдатнай базай харавіка-дырыжора, які валодае ўсім арсеналам тэарэтычных і практычных ведаў па гісторыі старажытнай і сучаснай беларускай пеўчай культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ